УДК 94(476)"04/18"

***А.В. БЕЛЫ, А.Ю. ЛАТЫШОНАК***

# ВЕНГЕРСКА-БЕЛАРУСКІЯ ДАЧЫНЕННІ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ І РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ

*У артыкуле разглядаецца маладаследаваная ў айчыннай гістарыяграфіі праблема – беларуска-венгерскія ўзаемадачыненні і культурныя кантакты з XIII і па XVIII ст. У навуковы ўжытак упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі ўводзяцца невядомыя беларускім даследчыкам венгерскія крыніцы, у якіх скарыстаны тэрміны "Белая Русь", "белыя русіны". Паказана, што венгерскі культурны ўплыў на ВКЛ найбольш адчувальным быў у другой палове XIV ст., пры Лаяшы Вялікім, і пазней у 1576 – 1586 гг., калі польскім каралём і вялікім князем літоўскім быў Стэфан Баторы. Абедзве гэтыя выбітныя асобы венгерскай гісторыі істотна прычыніліся да культурнай мадэрнізацыі Беларусі па заходніх узорах, хаця гэтыя венгерскія імпульсы перадаваліся праз польскае пасярэдніцтва.*

## Уводзіны

З усіх гістарычных рэгіёнаў Беларусі найважнейшую ролю ў беларуска-венгерскіх дачыненнях адыграла Заходняе Палессе (а таксама Падляшша), якое з канца XI па сярэдзіну XIV ст. уваходзіла спачатку ва Уладзіміра-Валынскае, а з 1199 г. – у аб'яднанае Галіцка-Валынскае княства. Як частка тэрыторыі Галіцка-Валынскай дзяржавы гэты рэгіён будучай Беларусі на працягу многіх стагоддзяў

прыцягваў увагу венгерскай кароны, а пазней трансільванскіх князёў, з'яўляючыся апошнім рубяжом эфемерных венгерскіх прэтэнзій на ўсю галіцка-валынскую спадчыну. Усведамленне гэтых прэтэнзій – ключавы момант для разумення прадмета гэтага артыкула. Яны таксама сведчаць аб тым, што гісторыя дачыненняў Венгрыі з Беларуссю ў значнай ступені ўключаецца ў гісторыю венгерска-ўкраінскіх стасункаў.

## Асноўная частка

Першы магчымы, хаця яшчэ надта невыразны след беларуска-венгерскіх дачыненняў датуецца пачаткам XIII ст. Як і наступныя кантакты, ён выкліканы экспансіяністскімі планамі Венгрыі ў дачыненні да Галіча. Ён гіпатэтычна рэканструяваны расійскім даследчыкам А. Назаранкам [8, с. 639-640], да якога мы асцярожна далучаемся.

Згодна з "Суздальскім летапісам" у 1217 – 1218 гг. вялікага князя Уладзімірскага Канстанціна Усеваладавіча наведаў полацкі епіскап Уладзімір і прынёс яму царкоўныя дары з Канстантынопаля: частку дрэва з крыжа Хрыстовага, мошчы Св. Логвіна, абедзве ягоныя рукі, мошчы Марыі Магдалены і інш. [11; 12, с. 204]. А. Назаранка не выключае, што полацкі епіскап быў паслом ад венгерскага караля Эндрэ II, які ў 1217 – 1218 гг. знаходзіўся ў крыжовым паходзе ў Палесціну, спрабуючы вярнуць Іерусалім [9, с. 200-201; 10, с. 246-247].

Уся гэтая гісторыя цікавая і тым, што, магчыма, ужо ў гэты час з'явілася назва "белыя русіны". Тытул "караля белых русінаў" прыпісваўся ў напісаным на стагоддзе пазней "Жыціі Святой Кінгі" галіцкаму каралю Кальману [16, p. 2453; 23, p. 685]. Бласлаўёная (а не святая, як сцвярджае "Жыціе Кунегундда" (1234 – 1292), больш вядомая пад сваім памяншальным венгерскім імем Кінга, была дачкой венгерскага караля Белы IV і жонкай кракаўскага князя Баляслава Сарамлівага. Аўтар "Жыція Святой Кінгі" ясна спасылаецца на венгерскую крыніцу (*Legitur in Cronicis Hungarorum*). На жаль, не захавалася ніякая сучасная Кальману крыніца, якая б пацвярджала незвычайны тытул Кальмана.

"Жыціе Святой Кінгі" было напісана, як мяркуецца, між 1317 і 1329 г. [25, p. 48-50]. Згадка пра Кальмана як "караля белых русінаў" магла папасці ў яго з гіпатэтычнай крыніцы, якой была не захаваная хроніка з часоў панавання венгерскага караля Стэфана (1270 – 1272). "Жыціе святой Кінгі" застаецца самай ранняй захаванай крыніцай, у якой згадваюцца "белыя русіны" [5; 18, p. 13-47; 19].

Найбольш інтэнсіўнымі (і найбольш варожымі) дачыненні паміж ВКЛ і Венгрыяй былі ў XIV ст., асабліва ў часы караля Лаяша I Вялікага (1342 – 1382). Пасля смерці апошняга гаспадара Галіцка-Валынскага княства (1340) Валынь са сталіцай у Луцку перайшла да Любарта Гедымінавіча, які прэтэндаваў і на Галіччыну. У 1340 – 1349 гг. галіцкае баярства па чарзе намінальна прызнавала гаспадаром то Любарта, то польскага караля Казіміра III, то Лаяша I. У лютым 1345 г. Лаяш у складзе войска крыжакоў беспаспяхова асаджаў Вільню, у 1349 – 1351 гг. арганізоўваў сумесныя з Польшчай паходы на Валынь, Падляшша і Берасцейшчыну [6, 13, 22]. Асабліва няўдалай для ВКЛ была вайна ў ліпені – жніўні 1351 г. 15 жніўня 1351 г. быў падпісаны дагавор з Кейстутам, паводле якога Кейстут і яго брат Альгерд абавязаліся прыняць хрышчэнне ў Будзе, у замен за што мелі з пасрэдніцтвам Лаяша атрымаць каралеўскую карону з рук Папы Рымскага [24, p. 152-153].

Апісанне гэтых перамоваў вядомае з хронікі ананімнага францысканца (*AnMin*), удзельніка апісаных падзей. Сучасная венгерская гістарыяграфія атаясамлівае яго з прыдворным клірыкам Людвіка I Янашам Кецы, які доўгі час кіраваў школай пры Эгерскім манастыры мінарытаў і суправаджаў караля ў яго

літоўскіх выправах. У гэтай хроніцы падуладная Любарту Валынь названая "зямлёй белых русінаў". *AnMin* захавалася ў складзе Дубніцкай хронікі (*Chronicon Dubnicense*) – копіі няпоўнага зводу агульнавенгерскай хронікі, перапісанай каля 1479 – 1480 гг. у трансільванскім горадзе Надзьварад (цяпер Орадзя Марэ, Румынія). Хроніка была знойдзена ў бібліятэцы графаў Ілешхазі ў Дубніцы (цяпер Дубніца-над-Вагам, Славакія), адкуль і атрымала сваю назву. Асноўны тэкст хронікі створаны значна раней: непасрэднай яе крыніцай з'яўляецца г. зв. "Ілюстраваная хроніка" (*Chronicon Pictum*), якую называюць яшчэ кампіляцыяй венгерскіх хронік XIV ст. [5, с. 107-108]. Пасля апісання няўдалай спробы венграў захапіць літоўскую крэпасць Бэлз (пры гэтай аблозе Людвік I быў паранены) на вербным тыдні 1352 г. (канец сакавіка – пачатак красавіка) хроніка паведамляе, што венгерскі кароль рушыў на Уладзімір-Валынскі "праз землі белых русінаў" (*per terram Alborum Rutenorum)* [15, p. 109; 20, s. 211]. Такім чынам, для аўтара гэтага паведамлення "зямлёй белых русінаў" была Валынь, а магчыма, і ўсё Галіцка-Валынскае княства.

Пасля заняцця Ляяшам польскага трону ў 1370 г. войны з ВКЛ узнавіліся, у 1377 г. Бэлз і Холм разам з Галіччынай часова ўвайшлі ў склад Венгрыі; Любарт, падольскія князі Аляксандр і Барыс Карыятавічы і ратненскі князь Фёдар Альгердавіч (якому належаў і Кобрын з акругай) прызналі сюзэрэнітэт Венгрыі [14, с. 96; 21, p. 256-257]. Такім чынам, на кароткі час невялікі кавалак тэрыторыі сённяшняй Беларусі апынуўся пад фармальнай уладай венгерскай кароны (адзіны вядомы прэцэдэнт такога кшталту).

Інтарэсы ВКЛ і Венгрыі працягвалі сутыкацца ў змаганні за галіцка-валынскую спадчыну, да пачатку XV ст. Венгрыя давала прытулак князям, якія вялі змаганне супраць цэнтралізатарскай палітыкі Вітаўта, у прыватнасці, Свідрыгайлу, а таксама Фёдару Карыятавічу, які ў 1396 – 1414 гг. кіраваў некалькімі замкамі ў Закарпацці з цэнтрам у Мукачове (Мункач), а ў 1420 г. беспаспяхова спрабаваў вярнуць сабе Падолле. У 1370 – 1400-х гг. дзве дзяржавы таксама канкурыравалі за ўплыў на Малдаўскае княства [2, с. 58].

Польшчы, аднак, удалося адцясніць ВКЛ ад прамых дыпламатычных стасункаў з еўрапейскімі краінамі. Ужо мірны дагавор Польшчы і ВКЛ з Венгрыяй, саюзнікам Тэўтонскага ордэну ў Вялікай вайне 1409 – 1411 гг., у 1412 г. у Любоўлі (Славакія) быў заключаны Ягайлам ад імя Вітаўта, але без яго ўдзелу. Спробы Вітаўта падтрымліваць самастойныя зносіны з Венгрыяй пры каралі Сігізмундзе Люксембургу, як і аналагічныя спробы Жыгімонта Кейстутавіча (да 1439 г.) не былі паспяховымі. У далейшым назіраюцца толькі рэлікты памкненняў палітычнай эліты ВКЛ да паўнавартаснай знешняй палітыкі на Захадзе, у тым ліку ў дачыненні да Венгрыі.

У барацьбе за ўладу паміж двума прэтэндэнтамі на карону, якая разгарнулася ў Венгрыі пасля Мохачскай катастрофы 1526 г., палякі, як правіла, больш сімпатызавалі Янашу Запольяі, жанатаму з Ізабелай (дачкой Жыгімонта Старога і Боны); сярод літоўскіх магнатаў, схільных да глухой апазіцыі Боне, прыхільнікі Фердынанда сустракаліся часцей. Аўстрыйскія паслы ў Вільні ў 1528 г. адзначалі, што літоўскія паны-рада больш спрыяюць Габсбургам, чым палякі, апрача Канстанціна Астрожскага, які сімпатызаваў Запольяі. Выхадцы з ВКЛ непасрэдна удзельнічалі ў ваенных дзеяннях на баку Фердынанда, як, напрыклад, Іван Перасветаў, які ў 1535 г. быў нават яго паслом да малдаўскага гаспадара Пятра Рарэша. У 1532 г. Ілья Астрожскі, насуперак рашэнням сойма ВКЛ, прапаноўваў Фердынанду выставіць уласныя ўзброеныя атрады для вайны з Турцыяй [1, с. 401-402]. Ідэя аб дасягненні ВКЛ поўнай незалежнасці, што азначала разрыў канфедэратыўных сувязяў з Польшчай, прынамсі да канца XVII ст., заўжды мела пэўную колькасць

прыхільнікаў у ВКЛ, асабліва ва ўплывовых магнацкіх родах. У гэтым святле трэба разглядаць як невыпадковы эпізод з Радноцкім дагаворам 1657 г.

У першай дэкадзе снежня 1656 г. у г. Раднот у Трансільваніі паміж Швецыяй, Трансільваніяй, Брандэнбургска-Прускім курфюрствам і лідэрам украінскіх казакаў Багданам Хмяльніцкім быў заключаны так званы Радноцкі дагавор аб падзеле Рэчы Паспалітай [4, с. 69]. Адзін з яго ініцыятараў, трансільванскі князь Дзьёрдзь II Ракацы (György II Rákóczy), імкнуўся аднавіць адзіную "Вялікую Венгрыю", незалежную ад Габсбургаў і Асманскай імперыі, да якой хацеў далучыць і значную частку Рэчы Паспалітай. Паводле гэтага трактату і наступнага з'езда ў Шамас-Уйвары (студзень 1657 г.), меркавалася, што тытул польскага караля разам з Малапольшчай, Мазоўшам, Валынню, Падляшшам і Берасцейшчынай дастанецца Ракацы; астатняя частка Польскага каралеўства (за выняткам некаторых заходнепольскіх земляў, на якія прэтэндаваў стрыечны брат Багуслава Радзівіла брандэнбургскі курфюрст Фрыдрых Вільгельм) павінна была адысці да Швецыі разам з Курляндыяй і ваяводствамі ВКЛ – Віленскім, Троцкім і Інфлянцкім. На ўключэнне ўсходняй Беларусі ў склад сваёй дзяржавы разлічваў Б. Хмяльніцкі. Радноцкі трактат прадугледжваў стварэнне асобнага незалежнага спадчыннага княства для Багуслава Радзівіла, у якое павінна было ўвайсці Наваградскае ваяводства і некаторыя іншыя ўладанні Радзівілаў. Б. Радзівіл апратэстоўваў такія ўмовы падзелу і патрабаваў, каб Падляшша і Берасцейшчыну перадалі яму, а не Ракацы. Злучаныя сілы Ракацы і шведскага караля Карла X (каля 72 тыс. чалавек [17, s. 65]), якія ў траўні 1657 г. накіраваліся ў Беларусь, былі адной з самых вялікіх вайсковых груповак, якія з глыбокай старажытнасці да XVII ст. утргаліся ў краіну. Узяцце Бярэсця 23 мая 1657 г. шведска-трансільванска-казацкімі войскамі выклікала рэзкія пратэсты Радзівіла. 4 ліпеня 1657 г. ён накіраваў Карлу X ліст з заклікам загадаць палкоўніку Анрашу Гаўдзі (András Gaudi), трансільванскаму каменданту Бярэсця, перадаць горад і наваколле прыхільнікам Радзівіла, а таксама накіраваць шведскія атрады да Слуцка, каб прымусіць яго абаронцаў здаць горад Радзівілу. Змяненне знешнепалітычных абставінаў (паражэнне Трансільваніі ад Польшчы, уступленне Даніі ў вайну супраць Швецыі, смерць Б. Хмяльніцкага і г.д.) не на карысць хаўруснікаў прычынілася да таго, што Радноцкі трактат так і не набыў моцы, а створаны ім хаўрус распаўся [3, с. 114-130]. Радноцкі дагавор, які дапаўняў заключаную Радзівіламі крыху раней Кейданскую унію са Швецыяй, цікавы тым, што ў нейкім сэнсе быў першай спробай стварэння "заходнебеларускай" (паводле мадэрнізаванай тэрміналогіі) дзяржавы. Магчыма, на думку пра стварэнне асобнага княства Радзівілаў падштурхнуў прыклад Трансільваніі. Збліжэнне Радзівілаў з Ракацы пачалося яшчэ ў 1645 г., калі пры пасярэдніцтве Ракацы быў заключаны шлюб Януша *Радзівіла*, галавы "сепаратысцкай" партыі ў ВКЛ, з дачкой малдаўскага гаспадара Васіле Лупу, што стварала ўмовы для саюзу сепаратыстаў з Малдовай і Трансільваніяй. Паказальна, што амбіцыі Радзівілаў і Ракацы сутыкнуліся менавіта на Бярэсці. Тое, што Радноцкі эпізод не быў выпадковым для венгерскіх "імперскіх" амбіцый, пацвярджае і падтрымка Расіяй прэтэнзій Ферэнца Ракацы на польскі прастол праз паўстагоддзя (1707 – 1708) [7, с. 445-447]. Калі б падпісаны венгерска-расійскі дагавор удалося ажыццявіць, ён, хутчэй за ўсё, азначаў бы і падзел Рэчы Паспалітай, пры якім Ракацы даставаўся б будучы Паўднёвы Захад Беларусі.

Імаверна, шматвяковыя стратэгічныя планы венгерскай экспансіі паўплывалі ў рэшце рэшт на ўсталяванне мяжы паміж Аўстрыяй і Расіяй у выніку III падзела Рэчы Паспалітай у 1795 г., у якім Аўстрыі адышоў Поўдзень Падляшша.

## Заключэнне

У венгерскіх планах экспансіі на Усход XII – XVIII ст. здзіўляе надзвычайная паслядоўнасць і пераемнасць. Нягледзячы на эфемернасць і ўтапічнасць мэтаў гэтага "маршу на Ўсход", ён здолеў пакінуць сляды нават у такой далёкай ад Венгрыі культуры, як беларуская, істотна ўзбагаціўшы лексікон яе вобразаў і сімвалаў. Зусім праўдападобна, што спадчынай гэтага руху з'яўляецца сама назва беларусаў.

Венгерскі культурны ўплыў на ВКЛ найбольш адчувальным быў у другой палове XIV ст., пры Лаяшы Вялікім, і пазней, у 1576 – 1586 гг., калі польскім каралём і вялікім князем літоўскім быў Стэфан Баторы. Абедзве гэтыя выбітныя асобы венгерскай гісторыі істотна прычыніліся да культурнай мадэрнізацыі Беларусі па заходніх узорах, хаця гэтыя венгерскія імпульсы перадаваліся праз польскае пасярэдніцтва. Нягледзячы на эпізадычнасць венгерска-беларускіх гістарычных кантактаў, у іх можна прасачыць пэўную заканамернасць. Для сучаснай Беларусі, якая вельмі супярэчліва шукае сваё месца ў еўрапейскай супольнасці нацый, Венгрыя з'яўляецца адной з нямногіх краін, якія маюць даўнюю традыцыю ўдзелу ў спробах уцягнуць Беларусь у сферу ўплыву заходняй цывілізацыі, у сярэдневяковыі тоеснай з каталіцызмам.

У гэтым даследаванні мы не займаліся асобай Стэфана Баторыя, паколькі гэта патрабавала б асобнай працы. Адзначым толькі, што дзяржаўныя і ваенныя рэформы Баторыя дазволілі ў 1579 г. вызваліць з-пад маскоўскай улады Полацк і давесці да перамогі Інфлянцкую вайну 1558 – 1582 гг. Пры Баторыі канчаткова аформіўся нацыянальны шляхецкі строй адзення, венгерская пяхота-гайдукі стала ўзорам для фармавання пяхотных аддзелаў войска ВКЛ. Значная частка венграў з войска Баторыя засталася ў ВКЛ і ўлілася ў склад беларускага і літоўскага народаў. Баторы быў таксама першым польскім каралём і вялікім князем літоўскім, які афіцыйна стаў карыстацца назвай "Белая Русь" (у адносінах да ўсходніх зямель сённяшняй Беларусі).

Такім чынам, Венгрыя – адна з нямногіх еўрапейскіх краін (Польшча, Нямеччына, Італія, Швецыя), якія ў сярэдневяковыі і ранні новы час актыўна ўдзельнічалі ў перадачы агульнаеўрапейскіх культурных імпульсаў у Беларусь. Яна таксама ўносіла ў гэтую культурную плынь свае арыгінальныя здабыткі.

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Белы, А.*** Венгрыя / А Белы // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш.]. – Беларуская энцыклапедыя, 2005 – 2006. – Т. 1: Вялікае княства Літоўскае А-К / рэдкал. Г.П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш.]. – 2005. – 688 с.
2. ***Белы, А.*** Малдаўскае княства / А. Белы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / рэдкал. Г.П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш.]. – Беларуская энцыклапедыя, 1993 – 2003. – Т. 5: М-ПУД / М.В. Біч [і інш.]. – 1999. – 592 с.
3. ***Белы, А.*** Невядомыя эпізоды "невядомай вайны". Ваенныя дзеянні Швецыі супраць ВКЛ у 1656 – 1657 гг. вачыма Эрыка Дальберга / А. Белы // Спадчына. – 1999. – № 3. – С. 114-130.
4. ***Белы, А.*** Радноцкі дагавор 1656 / А. Белы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал. Г.П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш.]. – Беларуская энцыклапедыя, 1993 – 2003. – Т. 6: у 2 кн. Кн. 1: Пузыны-Усая / пад рэд. І.Я. Бараноўскага. – 2001. – 592 с.
5. ***Белы, А.*** Хроніка Белай Русі. Chronicon Russiae Albae. Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы / А. Белы. – Мінск, 2000. – 238 с.
6. ***Довнар-Запольский, М.В.*** Из истории литовско-польской борьбы за Волынь / М.В. Довнар-Запольский // Киевские университетские известия. – 1896. – № 8. – С. 13-22.
7. История Венгрии: в 3 т. Т. 1. – М., 1971.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

8. ***Назаренко, А.В.*** Древняя Русь на международных путях. Междисциплинарные очерки культурных, торговых, политических связей IX – XII вв. / А.В. Назаренко. – М., 2001. – 430 с.
9. ***Пашуто, В.Т.*** Очерки по истории Галицко-Волынской Руси / В.Т. Пашуто – М., 1950. – 319 с.
10. ***Пашуто, В.Т.*** Внешняя политика Древней Руси / В.Т. Пашуто – М., 1968. – 250 с.
11. Полное собрание русских летописей. – М.; Л.: Изд. АН СССР в Лгр., 1949. – Т. 25. – 411 с.
12. ***Татищев, В.Н.*** История Российская: в 7 т. / В.Н. Татищев – М.; Л.: 1963. – Т. 3. – 357 с.
13. ***Филевич, И.П.*** Борьба Польши и Литвы-Руси за галицко-владимирское наследие / И.П. Филевич. – СПб., 1890. – 340 с.
14. ***Шабульдо, В.Ф.*** Земли Юго-Западной Руси в составе Великого княжества Литовского / В.Ф. Шабульдо – Киев, 1987. – 210 с.
15. Anonymi Dvbnicensis. Liber de rebus Lvdovici R.H. // Analecta Monumentorum Hungariae historicum literarorium maximum inedita. – Budapestini, 1986.
16. ***Gombos, A.F.*** Catalogus fontium historiae Hungaricae, T. III. / A.F. Gombos – Budapestini. – № 5025. – 1938. – p. 2453.
17. ***Heyduk, B.*** Dahlbergh w Polsce. Dziennik i ryciny szwedzkie z dziejów “Potopu”. 1656 – 1657. / B. Heyduk. – Wrocław etc., 1971.
18. ***Łatyszonek, O.*** From White Russia to Belarus / O. Albaruthenicus Annus Łatyszonek. – T.V, 2004.
19. ***Łatyszonek, O.*** Pierwsze wzmianki o Białej Rusi i Białych Rusinach // O. Łatyszonek – Białoruskie Zeszyty Historyczne. – Z. 21, 2004.
20. ***Lewicki, A.*** Kilka przyczynków do dziejów Kazimierza Wielkiego / A. Lewicki // Kwartalnik Historyczny. R. III. – 1899. – S. 211.
21. ***Paszkiewicz, H.*** Początki Rusi / H. Paszkiewicz. – Kraków, 1996. – 590 s.
22. ***Paszkiewicz, H.*** Polityka ruska Kazimierza Wielkiego / H. Paszkiewicz. – Warszawa, 1925. – 367 s.
23. Rex autem Colomanus regis Bele germanus fuit rex Ruthenorum Alborum. Vita Sanctae Kyngae // Monumenta Poloniae Historica. Wyd. A. Bielowski. T. IV. Lwów, 1884. – p. 685.
24. ***Rowell, S.C.*** A pagan’s word: Lithuanian diplomatic procedure 1200 – 1385 / S.C. Rowell // Journal of Medieval History. – No. 18. – 1992. – P. 152-153.
25. ***Witkowska, M.H.S.*** Vita sanctae Kyngae ducissae Cracoviensis, Roczniki Humanistyczne, T. X, z. 2 / M.H.S. Witkowska. – Lublin, 1961. – 467 s.

Паступіў у рэдакцыю 13.12.2006 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова